**Яўген Міановіч**
(Беласток)

# Сітуацыя беларускага насельніцтва ў Польшчы ў 1949-1956 гадах

Палітыку дзяржаўных улад у адносінах да беларускай нацыянальнай меншасці немагчыма адназначна акрэсліць. Афіцыйна ніякай беларускай праблемы ў Польшчы не было. У беластоцкай прэсе не паказваліся ніякія інфармацыі пра існаванне на тэрыторыі ваяводства беларускай нацыянальнай меншасці. Не абазначае гэта, што не вялася тут ніякая нацыянальная палітыка. Наадварот, тадышнія ўлады рабілі шмат чаго, каб падтрымаць беларускую культуру, аднак не экспануючы яе вонкі. Палітыка ў адносінах да беларусаў пасля 1948 г. рашуча рознілася ад палітыкі, якая вялася ў 1946-1947 гадах.У 1948 г. польскія камуністы афіцыйна прызналі існаванне беларусаў у Польшчы, дазваляючы на аднаўленне беларускага школьніцтва. Апрача школ ствараліся таксама гмінныя культурныя ўстановы, якія ў працы выкарыстоўвалі мясцовы беларускі фальклор. Такі мадэль палітыкі вельмі адпавядаў менталітэту беларусаў, у якіх памяці аставаўся вобраз кашмару першых пасляваенных гадоў і якія не мелі патрэбы праяўляць вонкі сваю нацыянальную іншасць.

Палітычныя і эканамічныя змены ў Польшчы давалі беларускім сялянам вялікі шанц адмяніць сваё матэрыяльнае становішча. З іх пункту гледжання ўлада патрабавала не надта многа — толькі адабрэння сваіх дзеянняў. Не пытала яна ні пра нацыянальнасць, ні веравызнанне і прапанавала месца ў сваіх радах. Не патрабавала

kamunikat.org

таксама вялікай таленавітасці, ні адукаванасці, а толькі выразнага палітычнага самавызначэння. Для беларускіх сялян была гэта цана так малая, што без ніякіх сумненняў прынялі прапановы з боку ўлады. Новы палітычны парадак не ўспрымаўся беларускімі сялянамі як змена на горшае, а наадварот — усё паводде іх ішло ў напрамку лепшай будучыні. У мінулым не было нічога, па чым трэба было сумаваць. Нават першыя пасляваенныя гады ўспрымаліся беларусамі як змена на лепшае. У такой сітуацыі нават калектывізацыя не выклікала шоку сярод беларускага сялянства. Працэс стварання калгасаў пачаўся тут пры канцы саракавых гадоў, а яго паслядоўнасці былі нашмат горшыя, чым у польскім асяроддзі. Калектывізацыя на ўсходзе Беластоцкага ваяводства ў адрозннене ад захаду ахапіла болыпасць вёсак. Метады пабудовы новага парадку былі падобныя, як пры савецкай уладзе ў 1939-1941 гадах. Калгасы нідзе не былі формай добраахвотнай сялянскай актыўнасці. Апрача нахабнай агітацыі людзей, заахвочвалі ў калгасы адпаведнай эканамічнай палітыкай. Паболыпвалі колькасць збожжа і мяса для планавай здачы дзяржаве, павялічвалі грашовыя падаткі і шарваркі. Барацьба з „кулацтвам" руйнавала падставы прыватнай гаспадаркі. Таму раней ці пазней вёскі, якім прадбачана было „сацыялістычнае пераўтварэнне", трапілі ў калгасы, нягледзячы на тое, што амаль усе жыхары лічылі абсурдным новыя формы ўласнасці і гаспадарання[1]. Ва ўсходняй частцы Бельскага і Беластоцкага паветаў стваранне калгасаў ішло без праяваў вонкавай незадаволенасці з боку грамадства[2]. Псіхалагічныя бар'еры былі тут ліквідаваныя падчас савецкага перыяду ў 1939-1941 гадах, калі за найменшы пратэст адпраўлялі далёка на ўсход Савецкага Саюза. На пачатку 1941 г. існавала на тэрыторыі Беласточчыны 19 калгасаў, у тым ліку 18 ва ўсходняй яго частцы. Адзін толькі калгас падаравала савецкая ўлада палякам, недзе ў ваколіцы Ломжы[3]. Савецкія планы дачакаліся працягу іх рэалізацыі ў 1949 г. Да 1954 г. на тэрыторыі ўсходняй Беласточчыны створана 43 калгасы, у заходняй — толькі два[4]. У 1948 г. партыйныя ўлады правялі апытанне сярод жыхароў вёсак, якія апынуліся ў калгасах на пачатку саракавых гадоў[5]. Хаця не было ніводнага станоўчага выказвання пра

1 J. Kostrowicka, *Niektóre problemy rolnictwa w Polsce Ludowej 1945-1963,* „Zeszyty Naukowe SGPiS", z. 52, s. 146.

2 Archiwum Państwowe w Białymstoku (dalej: APwB), Akta byłego Archiwum Komitetu Wojewódzkiego PZPR (AKW PZPR), sygn. 1/VIII/16, k. 10.

3 Tamże, k. 4-31.

4 APwB, Powiatowa Rada Narodowa w Bielsku Podlaskim, teczka „Sprawy Wydziału Oświaty", k. 38.

5 APwB, AKW PZPR, sygn. 1/VIII/16, k. 4-31.



Перад кінатэатрам „Мальва" ў Крынках

Фотаз архіва „Нівы"

сацыялістычную гаспадарку савецкага перыяду, тыя вёскі першымі трапілі ў калгасы на пачатку 1949 г. Раней толькі ўзніклі калектыўныя гаспадаркі на матэрыяльнай базе даўніх фальваркаў. Хаця вельмі шчодра народная ўлада абдаравала былых вазакоў і парабкаў, іх зацікаўленне ўласнай гаспадаркай было вельмі малое. Таму гэтых гаспадароў нават не трэба было заахвочваць да калгасаў. Яны вярталіся толькі да сістэмы гаспадарання, якую добра ведалі, не здавалі прытым зямлю сваіх продкаў, з гаспадараннем на сваім не мелі ніякіх псіхалагічных сувязей. Не дамагаліся яны таксама зямлі пасля 1955 г., калі пачалося ліквідаванне калгасаў.

Асаблівую ўвагу на пачатку пяцідзесятых гадоў улады звярталі на развіццё беларускага школьніцтва. Упершыню ў Польшчы навучанне беларускай мовы трактавалася так, як навучанне іншых прадметаў. Ураднікі з Беластока і Варшавы, якія наведвалі беларускія школы, ставілі закіды дырэктарам, што настаўнікі і вучні дрэнна валодаюць беларускай літаратурнай мовай, што мала чытаюць газет і кніжак на роднай мове, што школы недастаткова ўдзельнічаюць у працэсе развіцця беларускай нацыянальнай свядомасці[6]. Гэта можа выглядае неверагодна, асабліва калі параўнаем з палітыкай, якая вялася двадцаць гадоў пасля. Партыйным і дзяржаўным уладам імпанавала палітычная актыўнасць беларусаў. Партыйная арганізацыя была амаль у кожнай вёсцы, моладзь

6 APwB, akta Prezydium Wojewódzkiej Rady Narodowej (dalej: WRN), teczka „Wizytacje i kontrola szkół z białoruskim językiem nauczania", k. 31; teczka nr 16 (akta nie ujęte w ewidencji), k. 10.

дзейнічала ў радах Саюза польскай моладзі, на першамайскія дэманстрацыі ехалі ў Беласток цэлыя сем'і, па загаду ўлад шчыльнымі радамі змагаліся з каларадскім жуком усе жыхары вёскі[7]. Такімі ўзорнымі грамадзянамі палякі толькі пачыналі быць, не праяўляючы прытым ніякага энтузіязму. Поспех у стваранні „новага чалавека" ў беларускім асяроддзі ацэньваўся ўладамі як вынік адпаведнай нацыянальнай, эканамічнай і асветнай палітыкі. „Dzięki pomocy państwa został wytępiony zabobon i upośledzenie wsi białoruskiej, zostały one zelektryfikowane i zradiofonizowane, podniosła się stopa życiowa mieszkańców", — сцвярджала пастанова Павятовай рады ў Бельску-Падляшскім ад красавіка 1954г.[8] Як паказчык дэмакратызацыі палітычнага жыцця ў Польшчы і талерантнасці новых улад успрымаўся ўдзел беларусаў у кіраўніцтве розных партыйных і дзяржаўных установаў (пару гадоў пасля ўзнікла атмасфера, якая прымушала тых жа беларусаў мяняць імёны і прозвішчы, калі былі яны надта характэрныя для беларускага асяроддзя).

З нейкай сарамлівасцю мясцовыя ўлады ўспрымалі факт недаразвітай нацыянальнай свядомасці беларусаў Беласточчыны. Неадрозніванне імі справаў нацыянальнай і дзяржаўнай прыналежнасці тлумачылі страхам, выплываючым з нядаўняй дзейнасці падполля і з дзяржаўнай палітыкі ў 1945-1947 гадах[9]. „Trzeba pomóc ludności białoruskiej w rozwoju jej kultury narodowej", — гаварылася сяродураднікаў ваяводскіх установаў[10]. Беларускае асяроддзе было для ваяводскіх улад знакамітым матэрыялам для розных эксперыментаў, якія часта праводзіліся па загаду цэнтральнай адміністрацыі. Калі на захадзе ваяводства палітыка сацыялістычных пераўтварэнняў вялася вельмі памяркоўна, ва ўсходняй рабілася гэта без ніякага абмежавання. Калектывізацыя, мабілізацыя моладзі ў брыгады „Службы Польшчы" мела тут прыкметы таталітарнасці. Прысутнасць жыхароў вёскі на фронце змагання з каларадскім жуком была тут амаль стапрацэнтнай[11]. У некаторых гмінах ураднікі беларускага паходжання вызначалі шарваркі велічынёю нават у 60 дзён у год. А калі хтосці не выконваў планаў, павышалі гэты ліміт на 50 працэнтаў[12]. Рэалізаваць патрабаванне ўраднікаў абазначала давесці сваю гаспадарку да руіны. Амаль кожны гаспадар пісаў тады

1 Tamże, Wizytacje..., k. 38; teczka „Organizacje szkół z niepolskim językiem nauczania 1955-1957", k. 14.
8 Tamże, Wizytacje..., k. 18.
9 Tamże, k. 23.
10 Tamże.
11 APwB, akta GRN w Białowieży, sygn. 1, k. 100.
12 Tamże.



Тыповы выгляд гарадской вуліцы ў час дзяржаўных і партыйных святкаванняў
Фота з архіва „Нівы"

прашэнне да войтаў, гмінных сакратароў партыі, каб паменшылі колькасць дзён дарэмнай працы[13].

Сяляне, якія вымушаны былі стаць калгаснікамі, стараліся раней прадаць сваю маёмасць, асабліва жывёлу. У калектыўную гаспадарку давалі найчасцей адну карову, адну свінню, некалькі курэй[14]. Вупраж пакідалі дома, бо ніхто амаль не верыў у трываласць сацыялістычнай гаспадаркі на беластоцкай вёсцы.

З розных крыніц плылі ў Прэзідыум Ваяводскай рады інфармацыі, што калгаснікі ў канцы мая яшчэ не пачалі садзіць бульбу. Рабочыя працавалі ў гэтым часе ў сваякоў, якія мелі яшчэ прыватныя гаспадаркі і там стараліся забяспечыць сабе гэты прадукт на зіму[15]. У некаторых калгасах свінні так часта здыхалі, а каровы так мала давалі малака, што стала гэта падазроным нават маладым актывістам, якіх партыя паслала ў вёску вучыць сялян сацыялістычных метадаў гаспадарання. Старшыні калгасаў рашаліся нават ставіць вартаўнікоў каля хлявоў, каб кругласутачна пільнавалі супольную жывёлу[16]. Кіраўнікамі сацыялістычных аграрных камбінатаў часта ставіліся маладыя людзі, якіх веды пра агратэхніку ці гадоўлю жывёлы былі амаль нулявыя. Тым не менш іх загады трэба было выконваць. Без супрацiўлення ў тамтых гадах садзілі нават згнілую бульбу (добрай не было ў калгасных запасах),

13 Tamże, sygn. 21, k. 14 i n.
12 Tamże, akta Rolniczego Zespołu Spółdzielczego w Bobrownikach, sygn. 1, k. 1-12.
15 Tamże.
16 APWB, akta Rolniczego Zespołu Spółdzielczego w Czerewkach, sygn. 2, k. 41.

хаця сяляне былі перакананы ў абсурднасці і бяссэнснасці працы, якую выконвалі[17].

Калектывізацыя беларускай вёскі была важным фактарам, паскараючым працэс яе спусташэння. Бесперспектыўнасць на атрыманне бацькоўскай спадчыны прымушала маладых людзей шукаць шчасце і працу ў гарадах, на „вялікіх інвестыцыях сацыялізму", ці на г.зв. „вернутых землях" на захадзе і поўначы Польшчы. Супадала гэта з вялікай прапагандысцкай акцыяй заахвочвання вясковай моладзі да пошукаў жыццёвых шанцаў у іншым асяроддзі[18]. У выпадку беларускай моладзі была гэта эміграцыя ў іншы свет, у зону польскай культуры і, адначасова, знакамітых умоў асіміляцыі ў новым нацыянальным, культурным і моўным асяроддзі.

Палітыка камуністычных улад у 1949-1956 гадах стварала вялізныя шанцы рабіць кар'еру для тых, якія ў нармальных умовах не мелі б ніякіх магчымасцей пакінуць сферу вясковай галечы. Для беднай сялянскай моладзі дарога да змен вяла цераз войска, міліцыю, партыйны апарат ці службу бяспекі. Праца ў гэтых установах патрабавала прынамсі вонкава паказваць сябе як паляка. Гэта абазначае, што калі нават партыйны деяч ці афіцэр меў беларускую нацыянальную свядомасць, усё, што з гэтым звязанае, мусіў абмежаваць да ўнутранных перажыванняў. У рэчаіснасці амаль усе беларускія вяскоўцы, якім прыйшлося стаць дзяржаўнымі ці партыйнымі функцыянерамі, выконвалі свае абавязкі, нават сярод беларускамоўных жыхароў Беласточчыны, карыстаючыся польскай мовай[19]. На дзяржаўнай працы, паводле іх перакананняў, а магчыма таксама што і загадаў кіраўніцтва, абавязвала „дзяржаўная" мова. Сітуацыя такая не раздражняла аднак гэтых наменклатуршчыкаў беларускага паходжання. Мова, на якой яны звярталіся да беларускамоўнага насельніцтва, адрознівала іх ад сялянскага акружэння, набілітавала перш за ўсё ва ўласных вачах, але таксама таго ж грамадства. З гэтай прычыны, без спецыяльнага вонкавага ціску, урадніккі, настаўнікі, дзеячы — беларусы — пераўтвараліся ў паланізатараў асяроддзя, з якога выйшлі.

Дэмакратызацыя палітычнага жыцця ў Польшчы, якая пачалася ў 1955 г., вельмі хутка дазволіла беларускім сялянам скінуць маску некрытычных паклоннікаў народнай улады. Усе раптам захацелі выйсці з калгасаў, усе пачалі дамагацца вяртання ім зямлі і маёмасці, якую вымушаныя былі аддаць у свой час у супольнае карыстанне.

17 Tamże, k. 42.

18 APwB, akta Prezydium WRN w Białymstoku, teczka „Szkoła Podstawowa i LO z białoruskim językiem nauczania w Bielsku Podlaskim", k. 31.

19 С. Яновіч, *Каб мова не раздзяляла,* „Беларускі каляндар", 1964, с.61.



Гайнаўка бярэ шэфства над аднайменным суднам

Фотаз архіва „Нівы"

Хваля антыбеларускіх настрояў, якая з'явілася тады на Беласточчыне, выклікала яшчэ раз перапалох сярод беларусаў. У некаторых вёсках і мястэчках бацькі пачалі дамагацца ліквідацыі навучання беларускай мовы[20]. Рэдка аднак, звяртаючыся да ўлад з такой прапановай, адкрыта заяўлялі, што баяцца за лёс сваіх дзяцей, якія дрэнна валодалі польскай мовай. У сярэдніх школах адрозніваліся яны ад палякаў, што спрыяла ўзніканню ўсялякіх канфліктаў. У прафесіянальных школах, куды найчасцей траплялі беларусы, каб не адрозніванцца ад палякаў патрэбнае было прынамсі валоданне польскай мовай. Бацькі звярталіся ў беластоцкую кураторыю, каб спыніць навучанне беларускай мовы аргументуючы, што перашкаджае яна ў вывучэнні рускай і польскай моў[21]. Тадышнія ўлады зусім аднак не былі зацікаўленыя ліквідацыяй навучання беларускай мовы. Пераконвалі беларусаў аб патрэбе вывучэныя роднай мовы, адклікаліся да нацыянальнага гонару, але толькі стабілізацыя палітычнай сітуацыі пасля 1956 г. затрымала разбуральныя працэсы ў беларускім школьніцтве. Антыбеларускі нацыяналізм палякаў, а асабліва папулярызацыя міфалогіі пра імкненне беларусаў далучыць Беласточчыну да Савецкага Саюза, яшчэ мацней накіроўвала іх у бок улады і пераконвала, што толькі там можна шукаць абароны[22].

Неўзабаве былі створаны Беларускае грамадска-культурнае таварыства (БГКТ), тыднёвік „Ніва", Кафедра беларускай філалогіі ў Варшаве, а I сакратаром Ваяводскагакамітэта ПАРП у Беластоку стаў Аркадзь Лашэвіч, былы дзеяч Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі. Хаця шмат беларусаў працавала тады ў партыйным апараце, міліцыі, службах бяспекі, адміністрацыі, нідзе аднак не было відаць беларушчыны. Нават там, дзе ўраднікі і іх наведвальнікі былі беларусамі, гаварылі яны паміж сабою на дзяржаўнай мове. Гэтак званыя „нашыя хлопцы" былі шчырымі патрыётамі Народнай Польшчы. Дзякуючы польскасці ў пээнэраўскім выданні, яны сталі ўраднікамі, афіцэрамі — „людзмі", забыліся пра голад, прыніжэнне, якое зведалі іх бацькі і часткова яны самі.

Беларуская мова ніколі не стала мовай дзяржаўных устаноў, хаця была для гэтага спрыяльная атмасфера. У 1956 г., хаця і ўзніклі структуры беларускай арганізацыі, сітуацыя беларускай меншасці дасягнула пэўнага ўзроўню стабільнасці. Дзяржаўныя ўлады пачалі адыходзіць ад актыўнай нацыянальнай палітыкі і абмяжоўвацца да кантролю таго, што арганізавалася самімі беларусамі. Перыяд

20 APwB, akta Prezydium WRN, teczka nr 16, k. 16-32.
21 Tamże, k. 34-36.
22 *Што з намі будзе,* „Ніва", н-р 38, 18.XI.1956 г.



Народны фэст у Рыбалах

Фота з архіва „Нівы"

пасіўнасці трываў даволі доўга — амаль да канца шасцідзесятых гадоў.


### Streszczenie

Polityki władz państwowych w stosunku do ludności białoruskiej w latach 1949-1956 nie można jednoznacznie określić. Z jednej strony oficjalnie nie mówiło się o istnieniu jakiejkolwiek mniejszości narodowej w Polsce, z drugiej zaś sprzyjano odbudowie szkolnictwa w języku ojczystym oraz różnych form życia kulturalnego na bazie miejscowego folkloru. Jednocześnie był to okres niebywałych szans awansu społecznego dla ubogich chłopów białoruskich. W pogoni za awansem opowiedzieli się oni jednoznacznie po stronie tzw. „władzy ludowej". Kolektywizacja, która na Białostocczyźnie objęła głównie tereny zamieszkałe przez Białorusinów, przyczyniła się tu do przyśpieszenia procesów migracyjnych, a jednocześnie do dezintegracji tradycyjnych wiejskich wartości i struktur społecznych. Przełom polityczny w polowie lat 50. jedynie zwolnił tempo przeobrażeń społecznych i ekonomicznych zapoczątkowanych w 1949 r.

### Summary

The policy of state authorities with regard to the Belarasian population in Poland in 1949-1956 cannot be determined with a single term. On the one hand, the official point of view did not recognize any national minorities in Poland, while on the other, the authorities supported the restoration of schools and education in minority languages and promoted various cultural activities on the basis of local folklore. At the same time, this was a period of tremendous social rise for poor Belarasian peasants. In their pursuit of social upgrading, they unequivocally took the side of the „people's authority." The cołlectivization in the Białystok region, which chiefly comprised areas inhabited by Belarusians, sped up migration

processes, as well as the disintegration of traditional rural communities and cultural values. A political turning point in the mid 1950s somewhat slowed the rate of social and economic transformations launched in 1949.

KAMUNIKAT.org